2. Сепир, Э. Язык, раса, культура / Э. Сепир // Избранные труды по языкознанию и культурологии. – М., 1993. – 297 с.

3. Толстой Н. И. Язык и культура / Н. И. Толстой // Язык и народная культура. Очерки по славянской мифологии и этнолингвистике / Н. И. Толстой. – М., 1995. – С. 47–93.

**Гарбачык М.Р.**
*(Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»)*

## СІСТЭМА ПРАЦЫ ПА ПРАФІЛАКТЫЦЫ І ЎСТАРАНЕННІ СТЫЛІСТЫЧНЫХ ПАМЫЛАК У МАЎЛЕННІ ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

Важнае месца ў рабоце па фарміраванні культуры маўлення займае сістэма па прафілактыцы і ўстараненні стылістычных памылак у маўленні вучняў. Стылістычныя памылкі дзеляцца на маўленчыя і немаўленчыя. Маўленчыя памылкі – гэта няўдала выбранае слова, няправільна пабудаваны сказ, скажоная марфалагічная форма і інш. Да такіх памылак адносяцца: 1) лексіка-стылістычныя (паўтор слоў, ужыванне слова ў недакладным значэнні, парушэнне лексічнай спалучальнасці слоў, ужыванне слова без уліку яго эмацыянальнай афарбоўкі, ужыванне дыялектных і прастамоўных слоў і словазлучэнняў); 2) марфолага-стылістычныя (вучнё1ўская словатворчасць, выкарыстанне прастамоўных і дыялектных формаў слоў, пропуск марфем, утварэнне формаў множнага ліку тых назоўнікаў, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку і інш.); 3) сінтаксічна-стылістычныя (парушэнне нормаў кіравання, дапасавання, няправільны парадак слоў у сказе, парушэнне сэнсавай сувязі займеннікаў з іншымі словамі, неадпаведнасць часава-трывальных формаў дзеяслова, парушэнне межаў сказа і інш.)

Немаўленчыя памылкі: а) кампазіцыйныя (неадпаведнасць тэксту плану); б) лагічныя (пропуск неабходных слоў, эпізодаў, парушэнне лагічнай паслядоўнасці і абгрунтаванасці, ужыванне ў адным радзе паняццяў розных узроўняў, няўдалыя, парадаксальныя суджэнні); в) фактычныя (скажэнне фактаў рэчаіснасці). Прычынамі стылістычных памылак ў маўленні вучняў з'яўляюцца недастатковы слоўнік, уплыў моўнага асяроддзя, невысокае маўленчае развіццё малодшых школьнікаў, малы моўны (маўленчы) вопыт, недастатковае развіццё пачуцця мовы, недастатковая праца над тэкстам, непрадуманасць у выкарыстанні моўных аздінак (асабліва сказа і тэксту), няведанне функцыі займенніка ў мове (маўленні), псіхалагічны стан вучня і інш.

Сістэма выпраўлення і папярэджання памылак у маўленні вучняў, асабліва ва ўласных творчых працах, распрацоўваецца на аснове іх уліку,

класіфікацыі і вывучэння прычынаў узнікнення, г. зн. дыягностыкі, і ўваходзіць у агульную сістэму работы па культуры маўлення. Сістэма ўключае:

– выпраўленне маўленчых памылак у сшытках вучняў;

– складанне картатэкі творчых памылак, дапушчаных у вуснай і пісьмовай мове;

– вызначэнне тыпаў памылак і іх прычынаў;

– класная работа над агульнымі тыповымі памылкамі на ўроках аналізу пісьмовых творчых работ вучняў;

– індывідуальная і групавая ўрочная і пазаўрочная праца над асобнымі памылкамі; іх знаходжанне і выпраўленне;

– паказ і аналіз узорных тэкстаў (сказаў);

– сістэма стылістычных і іншых практыкаванняў;

– моўная падрыхтоўка перад уласнымі творчымі працамі вучняў (сачыненнем, пісьмовым пераказам, апавяданнем, пераказам);

– навучанне самаправерцы напісанага і яго рэдактаванне;

– стылістычныя акцэнты пры вывучэнні граматычных тэмаў.

Усе маўленчыя памылкі павінны быць выпраўлены, а вучань павінен усвядоміць прычыны іх узнікнення. У вусным маўленні ці пісьмовых працах моўныя памылкі адзначаюцца настаўнікам (пры дапамозе ўмоўных знакаў), а выпраўляюцца самімі вучнямі з дапамогай настаўніка. Толькі ў цяжкіх выпадках настаўнік можа выправіць памылку сам. На ўроку, прысвечаным аналізу сачыненняў, прачытваюцца ўслых лепшыя працы, а затым абмяркоўваюцца. Прадметам абмеркавання на такіх уроках з'яўляюцца не толькі змест, але і кампазіцыя тэксту, і мова, і памылкі, і недакладнасці, і выпраўленні. Для такога ўрока, як правіла, выбіраецца адна тэма, якая адпавядае дапушчаным памылкам, якая фарміруецца і асэнсоўваецца вучнямі, прыводзяцца прыклады выбару слова з мастацкіх тэкстаў, прапаноўваецца знайсці памылкі ў тэкстах, прапанаваныя вучнямі на картках. Прафілактыка маўленчых памылак праводзіцца пры вывучэнні граматычных тэмаў і абапіраецца на дыягностыку памылак у маўленні школьнікаў.

З мэтай прафілактыкі маўленчых памылак выкарыстоўваецца і такі від працы як рэдагаванне – адзін з актыўных відаў (праёмаў) працы з вучнямі над тэкстам. Рэдагаванне прадугледжвае выверку і выпраўленне напісанага: выпраўленне паўтораў, замена слоў сінонімамі, устараненне лагічных пропускаў, парушэнняў унутраных сувязей у тэксце і сказе, выверку арфаграфіі і пунктуацыі. Першапачаткова рэдагаванне носіць калектыўны характар. Кожны ўрок рэдакціравання прысвечаны канкрэтнай тэме. У працэсе агульнакласнай, калектыўнай працы (гутарка па пытаннях) з тэкстам, прапанаваным для рэдагавання, высняецца, ці патрэбна што-

небудзь выправіць, дапісаць, удакладніць, зрабіць больш дакладным ў дадзеным тэксце. Усе выпраўленні, прапанаваныя вучнямі, абмяркоўваюцца і ўносяцца ў тэкст. Адрэдагаваны тэкст запісваецца школьнікамі. Работа па рэдагаванні можа і павінна ўключацца амаль у кожны ўрок беларускай мовы як праца над словам (словаформай), словазлучэннем, сказам і тэкстам.

Заключным этапам навучання рэдагаванню з'яўляецца фарміраванне ўменняў самарэдагавання, г. зн. праверкі і самаўдасканалення ўласнага тэксту, якое выконваецца вучнямі пасля падрыхтоўкі ўласных творчых работ, г. зн. на апошнім этапе ўрока, калі скончана напісанне тэксту. З гэтай мэтай звычайна выкарыстоўваюцца памяткі па самаправерцы, у якіх прапаноўваецца парадак працы па ўдасканаленні тэксту сваёй работы. Пры самаправерцы настаўнік аказвае індывідуальную дапамогу вучням. Калі школьнік не можа сам пабачыць памылку ў сваёй працы, то настаўнік можа ўказаць тое месца, над якім вучань павінен яшчэ папрацаваць. Прама ўказваць на памылку можна толькі тады, калі настаўнік можа пераканацца ў няздольнасці вучня выправіць яе самастойна. Самарэдагаванне з'яўляецца дзеяннем самакантролю за сваім маўленнем.

Такім чынам, уменне кантраляваць сваё маўленне і ўносіць у яго карэктывы станоўча ўплывае на маўленчую дзейнасць вучняў, у прыватнасці, на ўменне гаварыць і пісаць.

**Гарбачык М.Р.**
*(Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»)*

## СУЧАСНАЯ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ Ў АДУКАЦЫІ

Культуралагічная канцэпцыя ў адукацыі, якая афармляецца ў цяперашні час як філасофска-педагагічная парадыгма, з'яўляецца лагічным працягам працэсу афармлення філасофіі адукацыі ў сучасных усходне-еўрапейскіх краінах.

М. Т. Аляксееў, Ф. Т. Ліхачоў, У. М. Рагозін, Т. Б. Сяргеева лічаць, што выдзяленне філасофіі адукацыі з агульнай філасофіі дэтэрмінавана некалькімі фактарамі: а) праблемнасцю статуса філасофіі ў сучаснай культуры і праблемнымі сітуацыямі ў самой культуры; б) з'яўленнем новых галін педагагічных ведаў; в) крызісам педагагічнай практыкі і педагагічнай навукі; г) рэфармаваннямі сістэмы адукацыі пры адсутнасці мэтаў і канцэпцый рэформаў, якія праводзяцца; д) крызісам адукацыі, як крызісам сацыяльных формаў навучання і выхавання, што заключаецца